

## Васіль ТКАЧОЎ

# НЕ ТОЛЬКІ ПРА СЯБЕ

У мяне было шчаслівае дзяцінства. Жыла наша сям'я не сказаць каб шыкоўна, але ў працавітых бацькоў кусель хлеба заўсёды меўся. Да таго ж, бацька нярэдка прывозіў з горада кнігі, тады мы чыталі іх усе разам, падключаліся і сябрукі. Дзверы нашай хаты былі адчынены для кожнага, я ганарыўся, што да нас заходзяць людзі. Маіх бацькоў – вясковых настаўнікаў – паважалі, прасілі напісаць тую ці іншую паперку, раіліся, дзяліліся людзі і сваім болем, і радасцю.

Ад бацькоў, ад дзядоў і бабуль я стараўся ўзяць усё лепшае. Нешта ўдалося, нешта – не. А нарадзіўся я ў в. Гута Рагачоўскага раёна 1 студзеня 1948 г. Нарадзіўся ў хаце, на палацях. Гэта хата майго дзеда Якава і бабы Палагеі...

Вось напісаў: «У мяне было шчаслівае дзяцінства». Дзяцінства, мабыць, заўсёды шчаслівае, хоць і не сытае, бывае, і нават галоднае. Відаць, так. Бо ўсе няшчасці і выпрабаванні абрынуцца на чалавека потым, калі мінуць першыя гады твайго жыцця, калі надыдзе час зарабляць кавалак хлеба, калі сустрэнешся з людской чэрствасцю, хлуснёй, жорсткасцю. Было ўсяго і ў мяне. Але гэта, як правіла, надавала толькі больш моцы, духу. І ў сэнсе самаго жыцця і непасрэдна творчасці.

Што найбольш запомнілася з дзяцінства?

...Вельмі багата снегу на вуліцах, малеча з больш дарослымі пацанамі капае тунэлі. Зайцы ў капканах. Абгрызеныя імі яблыні. Вечарамі шум і гам на гары: хто на чым едзе з яе ўніз і, здаецца, тут уся вёска. Каталіся ў асноўным на драцянках.Канькі – рэдкасць. Пазней працавалі на школьнай трусагадоўчай ферме. Падарунак – кашуля. Я і цяпер яе помню. Прыгожая. Уручаў сам дырэктар школы нябожчык Іван Іванавіч Хамічкоў. Бацька купіў фотаапарат, веласіпед «Арляня». Нарадзіўся брат Міша. Збіраў грошы, каб выкупіць яго ў радзільным доме. К таму часу, калі з'явілася на свет сястра Таня, паразумнеў. Потым нараджэнне двайнюкоў Валодзі і Сашы. Вось усе яны, я ды плюс мама Вольга Якаўлеўна і бацька Юры Трафімавіч – мая любімая сям'я. У нас цяпер у кожнага свае сем'і, але і гэтая не распадаецца: усе, дзякуй богу, жывы і здаровы, не ачарствелі душамі... Збярог сяброўства і з многімі вясковымі хлопцамі, з якімі разам раслі. Валік Юрчанка, Міша Лапчанка, Барыс Поляк, Лёня Шурмялёў, Толік Ганчароў... Валодзя Панадысёў памер да балючага рана.

Эх, дзяцінства, дзяцінства! Вярнуць бы цябе хоць на дзянёчак! Апрануць бы тыя лахманы, з'есці праснак з мёрзлай калгаснай бульбы, пакатацца б на крыгах у лёдаход. Не вернеш. Прынамсі, не ўсё і вярнуць хочацца. Тут успомніш што-небудзь такое – і вушы чырванеюць. Але то былі ўрокі. На ўсё

жыццё. Узяць іх трэба было абавязкова. Хапала гэтых урокаў і потым, калі вучыўся ў школе (Іскамская васьмігодка Быхаўскага раёна, там настаўнічалі бацькі, там і сёння яны жывуць; Ільічоўская СШ Рагачоўскага раёна), калі служыў у арміі. Пра армію хочацца сказаць усё ж некалькі слоў. Яна – асаблівая старонка ў маёй біяграфіі. Закончыўшы вучэбнае падраздзяленне, у званні малодшага сяржанта трапіў служыць на касмадром Байканур у хімічную лабараторыю, дзе давялося рабіць самыя сапраўдныя аналізы ракетнага паліва, ды яшчэ на той пляцоўцы, адкуль узляцеў Юрый Гагарын. Затым быў інструктарам палітычнага аддзела па камсамольскай рабоце, перад стартамі касманаўтаў наязджала ў Ленінск (ён пры мне і Сонцаградам быў) шмат вядомых журналістаў (Я. Галаванаў, Ю. Лятуноў, В. Пяскоў). Даводзілася з імі сустракацца, размаўляць. А тым часам акруговая газета «Фрунзевец» рэкамендавала мяне на факультэт журналістыкі Львоўскага вышэйшага ваенна-палітычнага вучылішча. Паступіў. Скончыў. Трапіў у дывізіёнку, у Ашхабад. Але не мог я без Беларусі, без бярозак, без роднай мовы. Праз 13 год блукання па свеце вярнуўся дадому, тут някепска прыжыўся. Шмат пісаў. Нешта выдаў. Але большасць – не, пакуль адлежваецца ў шафцы стала. Няхай. Усяму свой час. Да чытача дайшлі кнігі «Хітры Данік» (1975 г.), «Партрэт салдата» (1984 г.), «Дзень у горадзе» (1985 г.), «Пахвалі пражыты дзень» (1988 г.). Глядач убачыў спектаклі па маіх п'есах «Сівы бусел», «Вокны», «Прыгоды з Канапухіным», «Лесвіца», «Кветкі-ягадкі». Тэатры? Магілёў, Гомель, Віцебск, Йошкар-Ала, Рагачоў... Апошнюю п'есу «Ваўчар» надрукавала шматтыражка «Сельмашавец». Працуючы над п'есамі, давялося пабываць на Ўсесаюзных семінарах у Дубултах, Піцундзе, Рузе, дзе сустракаўся з вядомымі пісьменнікамі. То былі непаўторныя хвіліны. Непаўторныя!

Жыву ў Гомелі. Былі запрашэнні на перспектыўную працу ў Мінск, прапаноўвалі паехаць вучыцца на курсы сцэнарыстаў у Маскву, але я чамусьці перакананы, што само жыццё і тыя людзі, сярод якіх я праводжу залаты свой час, навучаць пісьменніка лепш за любых прафесараў.

Задумак шмат. Спадзяюся, што яны здзейсняцца. Дай Бог нам толькі ўсім здароўя!

## МІХАСЬКА — СУСЕД ГЕНЕРАЛА

Яшчэ адзін дом-прыгажун вырас у нашым горадзе. Цагляны, шматпавярховы, з вялікімі вокнамі! Навасёлы рады: будуць жыць амаль у самым цэнтры сталіцы.

Не менш за дарослых радуецца і Міхаська: на адной лесвічнай пляцоўцы з ім жыве генерал. Гэта дзякуючы яму, генералу, Міхаська апынуўся ў цэнтры ўвагі хлапчукоў усяго двара.

Хлапчукі падыходзяць да Міхаські, па чарзе вітаюцца з ім за руку, цікавяцца:

— Дома генерал?

— Не прыехаў яшчэ,— важна адказвае Міхаська, нібыта і на самай справе ведае, куды паехаў генерал, у колькі гадзін вернецца. Можна нават падумаць, што Міхаська ў яго ад'ютантам служыць.

— Сёння на «Волзе» паехаў?

Міхаська спаў, калі па генерала прыехала легкавушка. Аднак з выглядам дасведчанага чалавека адказвае:

— На «Волзе»!

Хлапчукі пэўны час маўчаць. Байчэйшы, Петрык, нарэшце пытае:

— А ці праўда, Міхаська, што твой сусед з пісталета страляе, як алімпійскі чэмпіён?

— Генерал усё умее рабіць,— кажа Міхаська.— Ён нават дывізію можа ў бой павесці, во!

— А роту?— дапытваецца Петрык.

— І роту,— адказвае Міхаська, а сам думае: што больш — дывізія ці рота?..

Хлупчукі, як тыя вераб'і, доўга шчабяталі перад акном генеральскай кватэры. Іх усё цікавіла: і што на службе робіць генерал, і як ён жыве. Рашылі ў акно заглянуць.

Акно высока ад зямлі, так проста не заглянеш. Петрык прыгнуўся, загадаў самаму маленькаму хлапчуку:

— Станавіся, Сяргейка, мне на спіну. Ты лёгкі.

Сяргейка спрытна залез на Петрыкаву спіну, прыпаў да шыбіны.

— Кажы, што бачыш,— прыспешвалі Сяргейку.— Ці вочы ад усяго разбягаюцца? Там ёсць на што паглядзець...

Сяргейка пачаў пералічваць:

— Стол стаіць. У куце — ложак драўляны. Яшчэ бачу канапу, тры крэслы...

Не злазячы з Петрыкавай спіны, Сяргейка з дакорам глянуў на Міхаську:

— А ты казаў: жыве — як цар! Такая ж кватэра, як і ў нас...

Ён саскочыў на зямлю, заявіў:

— Хлус ты, Міхаська, хоць і сусед генералаў.

Хлапчукі таксама накінуліся на Міхаську:

— А яшчэ хваліўся, што за руку з генералам вітаешся.

— Дома ў яго бываеш, чай п'еш.

— Эх ты!..

І хлапчукі разбрыліся па двары.

...Міхаська пачуў, як за спіной зарыпела тармазамі легкавушка. Ён азірнуўся. З машыны вылез генерал, але чамусьці ў цывільным адзенні, пры гальштуку, на галаве — капялюш. «Калі ў цывільным, дык такі, як усе, — здзівіўся Міхаська. — Як і мой тата».

І яшчэ Міхаська пашкадаваў, што хлапчукі назвалі яго хлусам. Ён жа сапраўды думаў, што генералы не такія, як усе астатнія людзі. А бачыце, што выйшла з гэтым суседствам.

Пачакайце, Міхаська, можа, яшчэ і чай будзе піць з генералам. Пэўна будзе, раз яны — суседзі.

## ДЫКТАНТ

Алесь дрэнна піша дыктанты. Памылка перад памылкай скача. Каб хлопчык трохі падцягнуўся, настаўніца параіла часцей пісаць дыктанты дома.

Вечарам Алесь прынёс тату падручнік і сказаў:

— Дыктуй, тата. Буду вучыцца пісаць без памылак.

Тата ахвотна дыктуе, Алесь старанна піша. І так некалькі дзён запар. А потым тата адклаў падручнік убок.

— Садзіся, сынок, пішы,— сказаў ён.— Сёння буду дыктаваць напамяць.

Алесь выводзіць сказ за сказам: «На двары адліга. Радасна свеціць сонейка. На вуліца — лужыны. Я не магу прайсці міма, абавязкова ўлезу ў ваду...»

Алесь глянуў на тату:

— Ты пра каго гэта так?

— Пішы, сынок, пішы...

Алесь працягвае пісаць: «Прыйдзеш дадому ўвесь мокры, брудны — вось маці і работа. А яна хацела адпачыць...»

— Дрэнны дыктант ты, тата, прыдумаў,— пачырванеў да вушэй Алесь.

— Гэта не я прыдумаў, а ты, сынок,— кажа тата і дыктуе далей.

Вечарам, зрабіўшы ўрокі, Алесь гадае, які дыктант ён будзе пісаць заўтра.

## ПАМОЧНІЦА

Калі Ала прыбегла са школы, маці якраз наводзіла парадак у пакоях. Сёння — субота, і ў гэты дзень у доме заўсёды, як кажа тата, генеральная ўборка.

Ала пахвалілася маме, што прынесла выдатную адзнаку, і сказала:

— Лісточкі кветак я памыю, а потым вазоны вадзічкай палью...

Даглядаць кветкі — любімы занятак дзяўчынкі. А ў пакоі мноства кветак. І ўсе прыгожыя-прыгожыя.

— Мама, што яшчэ мне рабіць?— спытала Ала, калі паліла кветкі.

У пакоі пасвятлела, стала больш утульна. Гэта таму, што кветкі нібы ажылі, расправілі лісточкі.

— Што яшчэ рабіць?— перапытала маці.— Пратры шкло на вокнах. Справішся?

Ала ўзялася за работу. Старалася. І выходзіла ў яе, як у сапраўднай гаспадыні. Шыбы адно папісквалі: піш-у, піш-у...

Потым дзяўчынка адышла ад акна падалей, каб паглядзець, ці ёсць на шкле яшчэ плямкі. Зірнула — і здзівілася...

Пытае ў маці:

— А дзе шкло? Я ж толькі яго працірала...

Маці ўсміхнулася і абняла Алу.

— Памочніца ты мая залатая! Шкло нікуды не падзелася. На сваім месцы яно. Гэта ты дужа добра справілася са сваёй работай. Плямак няма — вось і шкла не відаць...

## КАПРЫЗА

У нядзелю ўся наша сям'я збіралася ў госці да дзядзькі Мішы — на дзень нараджэння.

Мы прыбраліся ў свае святочныя касцюмы. Назбіралі ў гародчыку прыгожы букет кветак.

— Дзеці,— паклікала нас маці,— ідзіце абедаць.

— А мы ў дзядзькі Мішы паабедаем,— сказала Маня.

— Да дзядзькі Мішы мы пойдзем аж пад вечар. Ідзіце паешце дома.

— А што будзем есці?— спытаў Паўлік.

— Торт?— паглядзела на маму сястрычка.

— Не, варэнікі.

Наша мама ўмее гатаваць смачныя варэнікі. З тварагом, салодкія. Мы ўзялі па адным, а Паўлік зірнуў на стол і насупіўся.

— Бяры еш, сынок,— сказала мама.

— Не хачу варэнікаў, хачу халвы.

— Няма ўжо, скончылася,— адказала мама.

— Дай грошай, схажу куплю.

Мама дала Паўліку некалькі рублёў.

— Ну, ідзі, купі сабе.

Неўзабаве Паўлік вярнуўся з пустымі рукамі.

— Сёння ж выхадны. Заўтра куплю...

— Не,— выйшла з кухні мама,— давай грошы, бо заўтра ты ўжо будзеш абедаць разам з намі.

— А дзе мае варэнікі?— зірнуў хлопчык на пустую талерку.

— З'елі Маня з Мішам. А ты дакапрызіўся, сынок.

Паўлік захлімкаў, але ўжо было позна...

## ШЧАРБАТЫ НОЖ

— Парэж хлеб. Абедаць пара,— сказала тату мама.

Тата ўзяў сталовы нож і пачаў нарэзваць хлеб. Адрэзаў лустачку і здзіўлена глянуў на нас:

— Каторы гэта з вас так нож навастрыў? Ты, Паўлік?

— Не, татачка, не я!— спалохана адказаў брат.

— Ты, Міша?

— Не, я не вастрыў.

— Тады, відаць, гэта Таніна работа,— сказаў тата і дакорліва паківаў галавой.— Эх, якія з вас хлопцы — нажа навастрыць не можаце! Бярыце прыклад з Тані!

— Гэта я навастрыў, тата!— раптам узрадаваўся Паўлік.

— Ён хлусіць. Гэта мая работа!— падбег я.

— Абодва, значыць, вастрылі. Гэта і відаць,— тата паклаў на стол вышчар-

блены нож і сказаў: — Цяпер бярыце і рэжце на чарзе хлеб самі.

За сталом зрабілася ціха, а тата ўсё ж усміхнуўся...

## ЗАДЗІРЫ

Маленькі хлопчык Юраська сядзеў у пакоі і назіраў, як на двары, прама пад самым клянком, разгарэўся бой. Толькі без стрэлаў, хоць па тэлевізары ішло кіно і там па-сапраўднаму стралялі. Два чубатыя вераб'і так моцна счапіліся, што пяр'ё ляціць з іх. І не думаюць мірыцца. «Можа грэюцца? — падумаў хлопчык.— Толькі не, не падобна. Сапраўдная бойка».

Юраська ніколі не бачыў, каб біліся вераб'і. Пеўні — дык гэта іншая справа. Недарэмна ж у народзе кажуць: «Што вы счапіліся, як пеўні ўсё роўна?»

— Цікава, што ж яны не падзялілі?— падумаў хлопчык і яшчэ больш уважліва пачаў прыглядацца да задзір.

Ага, дык вось у чым справа. Той верабей, што крышачку меншы, выдзяўбаў недзе ў снезе хлебную крошку, а другі — ён, па ўсяму бачна, — больш дужы і нахабны, убачыў спажыву і рашыў адабраць. Крошка тая ляжыць побач, нібы прыз для пераможцы, а вераб'і, што ёсць моцы, дзяўбуць адзін аднаго.

— Не, так справа не пойдзе,— вырашыў Юраська.

Ён набраў поўную жменю зерня і сыпануў задзірам. Птушкі ўмомант супакоіліся, паглядзелі на добрага хлопчыка і дружна пачалі шчыраваць — ды так, ажно хвосцікі ўпрысядкі ходзяць.

Вось так Юраська пагодзіў птушак.

## ЦІХАЕ МЕСЦА

Дзеці з падрыхтоўчай групы разам з выхавацельніцай Надзеяй Канстанцінаўнай пайшлі ў лес на экскурсію. Да лесу — блізка, рукой падаць. Але ўсё роўна, пакуль дайшлі да яго, там пахадзілі,— стаміліся.

— Зараз адпачнем, дзеці,— сказала выхавацельніца,— і пойдзем назад у садзік. Вось толькі ціхае месца знойдзем...

На прыгожай зялёнай палянцы прыселі адпачыць. Моўчкі сядзяць хлопчыкі і дзяўчынкі, аб нечым думаюць: пасля такой цікавай экскурсіі ў кожнага засталося шмат уражанняў. І раптам Ігарок кажа:

— Надзея Канстанцінаўна, вы сказалі, што мы знайшлі ціхае месца. А яно не ціхае...

— Чаму ты так рашыў, Ігарок?— выхавацельніца здзіўлена паглядзела на хлопчыка.

— Я чую, як птушкі спяваюць,— сказаў Ігарок.— Як лісточкі на дрэвах перашэптваюцца. І травінкі таксама. Прыслухайцеся, Надзея Канстанцінаўна...

Выхавацельніца пагладзіла малога па галоўцы, пахваліла:

— Малайчына ты, Ігарок, што не праходзіш міма зямнога хараства.

І ўсе дзеці прыслухаліся.

Спявалі птушкі.

Перашэпталіся лісточкі.

Звінеў камарык.

Шапацеў у траўцы жучок...

Бачыце, цяжка знайсці ў лесе ціхае месца. Як і на ўсёй вялікай і прыгожай нашай зямлі.